# ЗЯЛЁНЫ ХЛОПЧЫК

**Чатырохмоўная паэма**
**(беларуска-палеска-руска-прыродная)**

www.kamunikat.org

**1**

Нас у мацеры трое:
Бацька, брат, я.
Ёй суседкі гавораць:
“У цябе, Мань, -- сям”я!
Толькі жыць-пажываць
У жаночай красе.
Бо мужчын поўна ў хаце
І робяць усе”.
Гакаць дровы
Як пачнем на двары --
Шчэпкі ўгору,
Сіла гарыць!
А як выйдзем улетку
На луг пакасіць --
Побач маці, як кветка
Маладая, стаіць.
Мы павінны спыніцца,
Не гнаць вецярок,
Бо ў яе на хусцінцы
Прысеў матылёк.

www.kamunikat.org

**2**

У гладыш палажыла
Зялёнага хмелю,
Каб віно зашумела мяцеліцай
(Вунь як шуміць!).
Каб густым было й чорным --
Жменю
Сыпнула сухіх чарніц.
І пахучых вішань,
І бярозавую галінку --
Не пашкоціць яно.
Не стрымалася --
Адну слязінку
Ураніла--
І закіпела віно.
А потым на печы гудзела і пенілася,
Аж гліняны гладыш пачынаў звінець.
Мама будзілася раней пеўняў
І чакала мяне.
Я дастаўся нарэшце.
Матчына віно
Гарыць у кілішку
Смутнай віной.

**3**

Як стане ў грудзях
Сэрцу мулка --
Прыйдзі ка мне,
Вінец-рачулка,
І як ў дзяцінстве
Палюляй.

Ну й што ж, калі я ўжо вусаты!
Ў мужчынскім сэрцы не багата
Пякучых слёз.
Люляй, Вінец,
І слёз маіх не выцірай.
Праз іх я добра бачу.
Бо з любові плачу.
На цёплым полі
Жыта жнуць.
У даль і сінь
Лясы ідуць.
Пайду і я.
І азірацца
На мілы буду край.
Пакуль твая жывая маці —
Спяшы,
Свой край запамінай.

**4**

Свет потух во всех окошках,
Спит село и видит сны.
Тихи в небе зори-крошки.
Звуки ночи. Брошь луны.

Так легко мне. И ни грамма
Грусти нет. Молчу, не сплю.
Слышу, как читает мама,
И слова ловлю, ловлю.

Шепот звезд в оконной раме
Слит с шуршанием страниц.
Спит село. Читает мама.
Мир распахнут без границ.

www.kamunikat.org

**5**

Можа, песні тваe былі сумней?
Можа, тваё малако было саладзей?
Можа, гушкалі рукі тваe вышэй?
Якая ты,
Маці паэта?
Можа, ў сэрцы тваім болей дарог?
Можа, слёзы тваe саланей ад трывог?
Як выкажу цябе, мама, --
Назаві мяне Паэтам.

**6**

Стук твайго сэрца
Разбудзіў мяне --
І свет,
Заліты сонцам,
адкрыўся...

Першае слова,
Першы крок па зямлі,
Першая песня бору --
І над усім,
Як усхвалёваны гром,
Стук твайго сэрца,
Мама.

**7**

Пасля купання грэла нас шаша,
Яна была гарачаю, жывою.
Было нам добра сцішыцца-ляжаць,

Шаша гудзела пад даверлівай шчакою.
Дарогу мы любілі зя цяпло.
Яна ж дыхнула лёдам.
Многа
Насустрач колкіх ветраў пранясло,
Да ўперад-ўперад рвалася дарога.
Яе праз рэкі, нібы на руках,
Няслі мастоў двужылістыя палі.
І каб у бездань чорную не ўпала--
Слупкі ад страху пабялелі у гарах.
Паклонамі скрыпучых журавоў
Сустрэць на Беларусі выйшла вёска.
Дарога над разлівамі палёў
Растала ў высях лёгкаю палоскай.

**8**

Маленькімі сонцамі коцяцца
Па стрэхах чырвоныя ягады.
Бліскучыя, ў рукі просяцца
І ў лужы шкляныя падаюць.

А неба сінее на ўлонні іх,
А сонца іграе, бліскае.
Я стаў і лаўлю далонямі
Вясну, што такая блізкая.

Ды дзе ж яе зловіш! Радасна
Крыштальнай лавінай коціцца!
І падаюць кроплі, падаюць,
І ў сэрца просяцца.

**9**

Конь панура, маўкліва стаяў.

А гаспадар млеў ад шаленства.

Ён біў і біў каня па твары,

Як чалавека.

Але конь панура, маўкліва стаяў,

Ён не ўзнімаў грывастай галавы,

Не станавіўся на недасягальныя дыбы,

Не іржаў гнеўна і тонка.

Ён нават не бараніў сваіх вачэй,

Па якіх біў гаспадар.

Конь быў сляпы.

**10**

Паўнеба нарадзілася грукату.

Паўсонца ўспыхнула святла.

Паўмора хлынула з шумам

На спелую вішню…

А пасля навальніцы

На тонкай ножцы віселі:

Неба грому,

Сонца маланак

І адна маленькая чырвоная слязінка.

**11**

Як быццам, з таго свету,

З-пад валакністых тоняў

Святая мова гэта

Ўсплыве й патоне:

--Кум-кума,

пазыч палатна.

--Як вытчу, то пазычу,
А зараз няма.

Так пела ўсё азерца,
Таемнае, лясное,
Ў якога нават сэрца,
Заткалася травою.

**12**

Крыніца радасць сваю
Разліла ў люстэрку крыштальным.
Нахіляюся.
П”ю
Нябёсаў шаптанне:
“Мы, нябёсы, над вамі стаім
Смагай зямной і да ўзлёту прычынай.
Мы з надзеяй глядзім
У зямныя вышыні”.
П”ю --
І ўзлятаю.

**13**

Кругам-лугам галава --
Упаду я вобзем.
У абдымкі возьме
Трава.
Вочы зелівам засцеле.
Згіне небасхіл.
У тонкіх сцеблях
Згубяцца шляхі.
У ціхую завадзь

Абмакнецца вясло.
Паплыву ў памяць,
Дзе непатрэбна слоў.
Нахіляцца травы,
Будуць мяне лячыць.
А мурашкі старанна --
У рай валакчы.
Пылок суквеццяў
Снегам асыплецца тут.
Падумаю:
У гэтым свеце --
Волат я ці ліліпут?
Абодва мне сілы пазычаць
І позірк на свет.
Я ўпаў у траву як язычнік,
Падняўся -- паэт.

**14**

Жаўрукі-жаўрукі!
Над палямі песня.
Сонцу ад шумнакалосся паклон.
А ў небе так лёгка,
А ў небе не цесна.
Там край мацярынскі
Далёка-далёка відзён.
Сярод жыта стаю
І маўчу.
І сіняя песня
Надзеяй стаіць уваччу.

## 15

Аб тым, як зерне зямля сагрэла,
Дала яму сілы, святлом напаіла --
Зялёныя промні дружных услодаў раскажуць.
Як сцяблiны высокія моцна трымала,
На давала зламацца пад ветрам --
Аб гэтым белы гарачы колас прашэпча.
Як ураджаі грудзямі карміла,
Аддавала ўсе свае сокі --
Ад свежага жоўтага бохана можна дазнацца.
Як сама бляднела і сохла --
Зямля толькі рукам адкрыецца,
Калі яны лечаць яе і песцяць,
А яна аб далоні даверліва трэцца,
Бы коцік, мурлыча.

## 16

На маіх землякоў мяне мучыць
Адзіная крыўда:
За словы “счарнеў, як зямля”.
Чаму яны вочы закрылі на свет
І не сказалі: “счарнеў, як ноч”?
Або: “як паганая душа”?
Зямля не здраджвала, не маніла,
І раптам мудрыя людзі
Чорным убачылі
Самае дарагое і мілае.
Чаму?
Землякі паглядзелі на рукі,
Вечна чорныя ад працы на зямлі.

www.kamunikat.org

**17**

Зграя ваўкоў, львоў,
Жырафаў, мядзведзяў, псоў,
Скарпіёнаў, быкоў ...
Няўжо вас мала ў нас на зямлі,
Што вас у неба ўзнялі,
Каб вы сузор"ямі расцвілі,
Каб задраўшы галаву,
На вас дзівіцца,
Ды яшчэ й маліцца!

**18**

Засяліце, сябры, во-ось тую зорку.
Там будзе не горка,
Там салодка,
Бо вельмі далёка.
А сэрцу куды будзе там падзецца?
Сэрца на горкай зямлі застанецца.

**19**

Зноў вясна ў Горску!
Цішыня белапенных садоў
Званчэй
Цішыні бясхмарнага неба.
Ад шэпту
Светлай бярозы
Грудзі зайдуцца зямной бязважкасцю --
І ты паляцеў у космас Радзімы.

www.kamunikat.org

**20**

Калі нараджаецца
Новая рэчка
На грамніцы
Па свежай вясне
І засінееца
Сонцу настрэчу –-
Зямля становіцца
На нітку сіней.
Ды гэта ўбачаць
З вышыняў зацятых
Зоркі –- вочы неба
І людзей крылатых.

**21**

Да заблытанай ніткі
Чалавечага лёсу
Розных колераў
Многа ўплялося:
Зялёны і сіні,
Чорны і шэры,
Шчасця і суму,
Здрады і веры…
Таму вось і цяжка,
Немагчыма
Глянуць, разблытаць
Толькі вачыма.

www.kamunikat.org

**22**

З таемнай надзеяй,
З апошняе сілы
Жанчына ў нябёсы
Акно расчыніла.

Ды вольныя крылы
Так мала, так мала
У небе жанчыну
Трымалі.

Букецік засохлы
Трымціць на магіле
Жанчыны, што жытку
Нябесна любіла.

**23**

Ўсеночны дождж. Усхліпвалі снягі.
Як быццам, нейкі велікан маліўся,
Укленчыўшы, хрысціўся-мітусіўся --
Ці то ад радасці, ці ад тугі.

А ранкам я убачыў: ад слаты
Паніжалі снягі. Пасля малення
Павышалі, падняліся з каленяў
Худыя дрэвы і платы.

**24**

Мечтаю возвратиться в небо,
Где солнце, воздух и простор,
Где никогда я раньше не был,
А был мой пращур прапростой.

Мечтаю залететь на остров,
Без подлецов и дураков,
Где все естественно и просто,
Как на турнире петушков.

Но остров тот в туман одетый,
И в нем бегут вперегонки
Цивилизованные дети:
И подлецы, и дураки.

И в этом массовом забеге
Соревнованьем взнуздан я.
Бегу вослед, как песик пегий
В потемках мироздания.

**25**

Прама ў вочы мне глянуў
Бязгрэшны бор,
Не адвёў аніводнай галінкі.
Пад выноснымі соснамі
Я замёр —
Бессмяротны, магутны, вялікі…
Ападалі з іглiцы ільдзінкі
На раскудлачаны мох.
Бор мне ў вочы глядзеў,
А слязінак
Я, шчаслівы, заўважыць не змог…

**26**

Грэбу шыбоду-іглiцу,

Коб обложыты хату.

А лес пытае:

— Толік, дэ твой батько?

— Далёко. На цэліне у заробках.

— Ну, то грэбы, дытя,

Хай будэ тэпло у хаты зымою.

А дэ твоя маты?

— Лежыт хворая.

— Грэбы, дытя,

Я нэ буду плакаты,

Як бэз шыбоды замэрзну.

**27**

Як травы распласталіся ў алюры,

Як сосны спатыкнуліся ў бары —

Пашорхаюць, пашэпчуцца вятры,

Аціхлыя пасля смяротнай буры.

Ці ёсць гармонія ў прыродзе, ці няма?

О, каб магла яна сама, сама, сама

Алюрам траў рассыпацца й скакаць,

Каб соснам небяспеку прадказаць!

**28**

Ігліца сыплецца ў мурог,

І пасвятлелы бор сягоння.

І я блукаю задумённа,

Шукаю выйсця ад трывог.

Не гнуцца сосны, не рыпяць.

www.kamunikat.org

Стаяць ўваччу камлём стамлёным.
Ім доўга-доўга гадаваць
Маю вечназялёнасць.

**29**

Послевоенный лес,
Ровесник мой,
Уже немолодой,
Уже над головой
Сомкнулся весь.
И деревушку он
Обнял полукольцом,
Чтоб ветер-пустозвон
Ей не слепил лицо,
Сожженное в войне…
Та боль растет во мне –
Венец – венцом,
Венец – венцом…
Когда мой край пылал,
Когда серел в золе,
Я семенем лежал
В родной земле,
В тепле.
И произрос!
Воскрес корнями в глубину,
В историю,
В ту сторону,
Где в прошлую войну
Людей пожгли и лес.
Я слышу: в глубине
Пожар тот не остыл.
Корням моим расти

Чем глыбже – тем больней…

**30**

Няхай сёння ноччу пройдзе спорны дождж,
Каб зарунелі за вёскаю высахлыя паплавы,
Каб вільготным лістом трымцеў мой сад,
Каб салёнымі губы ў закаханых былі…
А я буду думаць аб іх усіх:
Як расце і ўмываецца на паплавах трава,
Як у садзе маім росны шум,
Як каханыя недзе туляцца пад павець…
А заўтра няхай будзе сонечны дзень,
Каб гусі вясковыя высыпалі на паплавы,
Каб яблыкам з сада блішчаць-рыпець,
Каб на душы закаханых светла было,
Каб яны нарадзілі новы свет,
Каб той свет быў такі, як гэты.
Лепшага свету — няма.

**31**

На перакручанай сасне
Гняздо вароны размясцілі,
Зіму варонную судзілі
І сумавалі па вясне.

Калі зялёныя дымкі
Ахуталі усе бярозы —
З сасны нявеtла і цвяроза
Тырчэлі голыя сукі.

Калі ж ахрыплае "кар-кар"
Заціхла перад мілым піскам —

Сасна зрабілася калыскай
Любві воранняе і мар...

Даруй, калючая Мадона,
Што гордасць замінае мне
Казаць: ″Цудоўныя вароны
Жывуць на велічнай сасне″.

**32**

Агароды былі за вёскаю, у нізку,
Зялёная таямніца была там.
Я роснай цыбулі наскуб
І зялёную таямніцу разгадваць стаў.
У сярэдзіне слізкай яна была
І таксама зялёнай, пякучай на язык.
Па капусце зялёная кропля паўзла.
А да кропу зялёны чмель прынік...
Юрка, я зялёна-беларускае люблю,
Там пратаплазма робіць свой цуд.
Ды нялёгка зялёнаму хлапцу
Сябе любіць за сваю зялёнасць.
Юрка! Я ў сябе ўлюблёны?!
Ноч
Зялёнымі старымі веснічкамі
Рыпіць-рыпіць.
Не сплю...

**33**

Што напісалі ў небе журавы
Асеннім шапатлівым клінапісам?
Тугою крыкі птушак праліліся

На горскія балоты й паплавы.

Рука спачыць лягла на стол пусты,
Як выраем затомленая птаха.
Паменела перадзімовых жахаў --
Асіны скінулі свае лісты.

**34**

Хістаецца у паднябессі
Дарогі пыльна-цёплы клін…
Здаецца, камень ўгору кінь —-
Ён хлыне жаўранкам на ўзлессе.

Усім нябесным і зямным
Да болю ў грудзях захлынуцца,
Палескай песняй абярнуцца,
Ад звонкай песні стаць нямым!

О вуглаваты почырк мой!
Зрадніся з роднаю зямлёй,
З тым зразумелым клінапісам,
Што ў небе родным растварыўся…

**35**

Салютаў зыркія снапы
На чорным небасхіле ўспыхнуць,
І знічкі вылушчацца ціха,
І абсяваюць дол сляпы.

Ўзнімі, жняя, над галавой
Тугі снапок буйнога жыта –

Спякотнай спеласцю наліты,
Ён громам шасне над табой!

**36**

Сонцэ злізало рыжы снег.
Тягнэ знекуль дымом.
Собакы нюхают мокрую зэмню,
Шукают якую костку.
Горчакы, як гусы, ідут до Кулёвца,
Коб послухаты радіво.
Побег і я, бо інтерэсно.
Набылоса ў хату людэй!
Стоят, плачут, сморкаюцца.
Радіво грае жалосно
І шыпыт, як гусак:
"Ссталін... ссталін... ссталін..."
А люды ідут і тыснуцца.
Тюотка Валяна кажэ:
"Бэжы, дытя, дохаты, а то задушат".
Я выпоўз на гуліцу.
Ужэ тэмно.
Аны  звэздынкы ў небы.
Я понёсса дохаты, нэ чуючы нуог.
"Гаў!!!" –
Дыхнула тэмра ў твар.
Мэнэ обдало жаром, як з печкы.
Я закрычаў од страху.
...Батько гладыў мэнэ по головцы:
"Нэ бойса, Толюнчык,
Здохнэ і гэты собака,
Як той, москоўскы".

**37**

Калі бабіна лета пачне паплавы ахутваць,
Сваё белае ніцце па свеце расцягваць і рваць,
Пачынае мой лес маўкліва пакутаваць -
Сваё лісце, сваю мову, губляць...
Позняй восенню,
Калі голас з грудзей яго вырве вецер,
Уздрыгне лес.
Крыкам нявыказаным і глухім
Ірвецца, мучыцца шалёнае мокрае веццe...
На глыбокія ўсхліпы лесу
Кладуцца снягі.
Невыносна быць нямым.
Лес!
Я смуткам жыву тваім
Па шумлівых вёснах.

**38**

Баба Ганна казала,
Шчо грыбочкы нэ люб’ят кагала,
Шчо схаваюцца ўсе як одын,
Колі ў лесы станэш крычаты,
Чы забудэш посра...
Пэрэд тым, як шукаты.
У грыбы мы ходылі ўтрох:
Брат Колька, друг Васька і я.
Утрох мы булі як одын —
Разом любылі лыко драты,
У клёка граты,
Гадюк забываты,
Спасаты деток вороны і гороб’я.

Вот пэршы кусточок леса грыбного,
І ў нас подгынаюцца ногы,
Шчоб прысесты з дорогы,
Зробыты “а-а”
Утрох як одын.
Толік, Васька і Коля --
Мы нэ забудэм ныколі:
Бэз “а-а” шчастя грыбного нэ будэ.
Мы знаем:
Так роб’ят ўсе горэцкіе люды,
Папо і мама,
Дед і баба,
Красавыца Надька
І Манька раба.

**39**

Людзі ў жыцці могуць не прарасці,
Як зерні ў полі,
Затопленыя паводкай:
Не прарастуць да сонца,
Не прарастуць да красавання,
Не прарастуць да сусекаў.

А людзі не прарастуць
Да дзіцячай галоўкі,
Да кахання,
Да дзяцей і ўнукаў,
Да мудрай сівізны --
Людзі,
Затопленыя крывёй вайны.



www.kamunikat.org

**40**

Я, як човен, веславаў
Да мора твайго, чысціня.
А рэчку глушыла трава,
І ліпла на вёслы яна.

Вырваўся я з травы –
Перасохла рэчка тады.
Я волакам, ледзь жывы,
Цягнуўся да чыстай вады.

А калі дацягнуўся, то
На першую хвалю ўпаў
І дзіравым сваім жыватом
Чысціню заглытваць стаў.
Я пайшоў на дно,
Дзе чысціні не відно.

Я ў цемры на дне,
На дне чысціні ляжу.
Плыве бліз мяне
Чорны жук.

**41**

Вясною
Лісты выбухаюць з пупышак,
Яны стартуюць на маю арбіту вакол Горска,
Мы ляцім побач, як зялёныя вераб"і,
То ўверх, то ўніз,
То ўправа, то ўлева…
Лес –- клубок, што знітаваў і мяне.

www.kamunikat.org

**42**

Сляпы
Ва ўсіх на віду.
І ён ад усіх закрыты,
Бо яго вочы –-
Не люстэрка ягонай душы.
Занадта многа нядобрых людей,
Побач з імі хачу аслепнуць.

**43**

Імчалі вострыя кліны
На глінабітных плітах
Праз бесканечнасць ўсіх арбітаў
Ў мае грудзі, ў мае сны.

І мне параненым хадзіць,
Мне думаць, марыць, хваляваццa,
Не раз ад болю не стрымацца -
І ноччу друга разбудзіць.

**44**

Шчасце, сябры,-
Малако на губах.
У каго не абсохла,
Той і шчасліы.

Чай надыйдзе –
Абсохне.
Ну, што ж,
Не трэба журыцца, браце.

www.kamunikat.org

Налівай віно!

**45**

Стаю ўначы.
Цвіркочуць конікі.
Неба над Горскам засыпана зоркамі.
Святло ад іх да мяне
Мільёны гадоў ідзе.
А колькі для мар чалавечых трэба
Гадоў, чакання, трывог, надзей,
Каб рвануцца з цесных грудзей
Да самай далёкай зоркі?
Адно імгненне!

Конікі цвіркочуць,
Нікуды не хочуць.
Застаюся з імі цвіркатаць!

**46**

За шыбай сонечнае ранне
Ўзялося пець:
“Чжый-чаць…
Чжы-ый-чацць…”
А ў хаце спяць.
Стамілася  за ноч каханне.

Сонца,
Трэба пачакаць,
Ў галовах ціхім шарам пастаяць.

www.kamunikat.org

**47**

Я люблю нечакана дамоў з”явіцца.
Мне доўга не хочацца вокны будзіць.
За імі так хораша маці спіцца.
Я сяджу і слухаю.
Маладзік паступова бляднее.
Раптам –
Скрып масніц.
Маці на вуліцу белым світаннем ляціць!
“Сынок!
А я чакала,
Прадчувала,
Не спала”.

**48**

Зіма --
Тужлівага чакання бесканечнасць.
Вясна --
Як радасць самазабыцця.
І летніх дзён --
Кароценькая вечнасць.
І восень --
Як вяртанне да жыцця.

**49**

На сенажаць іду,
Каб стаць ніжэй травы
І конікам пастракатаць.
А мне кажуць зверху:
“Бяры касу!”

www.kamunikat.org

Залезу на бярозу,
Каб стаць вольным,
І ветрыкам пашапацець.
А мне крычаць знізу:
“Забыў сякеру!”

Аднакласніцу вельмі люблю,
Не ем, не сплю.
А мне шэпчуць з усіх бакоў:
“Яна блядзь і жыдоўка”.

Каб людзей не чуць, не бачыць,
Выйду ўначы пад зоркі,
Разам з імі слухаю Толіка.

**50**

Зноў маладыя палыны
Ўзышлі на хатнішчах забытых
І забуялі дамавіта
Памяццю вайны.

О, колькі іх, сыноў, бацькоў,
Забытых і не забытых,
Мной не сустрэтых землякоў,
Зямлёю, травамі закрыта!

Палын гарачы, пыльны вяне.
Праз дым, праз попел нацянькі
Славяне,
Землякі,
Ка мне выходзяць і выходзяць

І не падаюць рукі.

**51**

Ў зялёным царстве нашае жытло.
З яго жывем, і сеем, і збіраем.
Бясконца разліваецца над краем
Зялёнае святло.

Пафарбавалі нават пад яго
Мы гімнасцёркі, танкі і гарматы,
Каб па кустах, зялёных і бухматых,
А не па нас, біў ворага агонь.

Мы ў масхалатах поўзалі між траў,
А тыя травы ціўкалі і пелі.
Мы тую мову зразумелі,
Хто пад яе ў зялёным царстве паміраў.

**52**

Заваёўнікі ўсіх вякоў,
Мянялі вам зброю
Ад пікі да танка,
Мянялі убранне
Ад чуба да рога,
Ды вечна нязменныя:
Форма крыжоў
На вашых магілах
І нашай Радзімы --
Залатое ранне,
Травінкі ззянне,
Павуцінкі трымценне,

Сінічкі-чубаткі:
“Ці-ці-тррч,
Ці-трр, ці-трр…”

**53**

Лістоў і птушак галасы
Згарэлі –
Сумная прыкмета.
Жывуць маўкліва манументы,
Як абгарэлыя лясы.

**54**

Без ветру ветразь --
Нішто.
Вясна без красак -–
Нішто.
Без песні птушка -–
Нішто.
А ўсё гэта -–
Нішто
Без мяне.

**55**

Устал я быть самим собой…
Но то, что было мной,
Учтите,
Вернется в этот мир
Травой,
Березой,
Ветром,

www.kamunikat.org

Синевой –-
Попробуйте-ка, затопчите!

**56**

Нет на свете ни одной
Речушки безымянной –-
С петлей бессмысленною, пьяной,
Со стайкой пескарей,
С туманом
И, разумеется, с водой.

Цветы и бабочки в лугах
Пестрят своими именами,
Навеки породнившись с нами
В озерах, реках и ручьях.

Деревья, травы, муравьи
И прочие букашки с ними –-
От нас заполучили имя
И признаки свои.

Неужто изменились времена
На белом свете?
Уже не мать, а сами дети
Придумывают имена?!

Нет, времена остались те же:
За листопадом грядет снежань,
И будет как всегда
Кипеть весенняя вода.

И ночь темна,

www.kamunikat.org

И день во свете…
Но человек, как властелин,
Решил в бессмысленные петли
Речушки неприметной
Вонзить канал,
Назвав его:
Н-Н-1.

Речушки имена теряют --
Для человека умирают,
Навсегда
В миры иные уходя.

Не может умереть вода,
Феномен перевоплощенья!
Пескарик превратится в червя,
Цветы -- в песчинок разноцветье,
А бабочки --
В кирпичный ветер.
Вода -- всегда вода.

Исчезнет здесь,
Возникнет там.
Любой червяк ей равносилен
Деревьям, травам, муравьям
И человеку иже с ними.

Свет белый не перековать.
И независимо от рода
Нас именами нарекает мать --
Природа.

## 57

Грукаталі па рэйках мае сны.
І ў свеце ўсім не было цішыні
Гэтай ноччу.
Толькі белая здань за акном прамільгне —
Так бярозы насустрач кідаліся мне
Растрывожаным досвіткам.
Лёгка скрыпнулі веснічкі.
Рук не адняў.
Агарнула мяне цішыня.
Толькі сэрца затахкала.
О, як ярка усход палымнеў
На гэтым світанні-вяртанні!

## 58

У хаце, дзе гулянка,
Нехта з хлопцаў спрытна
Пагасіў святло.
Ой, што тут было!

Гаспадар у хату
Увайшоў нячутна.
Запаліў святло.
Ой, што тут было!

І я там быў
З табой.

www.kamunikat.org

**59**

На выскабленым услоне
Таўканіцы кавалак бялеў.
Я браў яе далоняй,
Стаяў каля ўслона і еў.

Дзед вачмі задаволена бліскаў,
Ён добра мяне частаваў!
Не знайшоўшы у хаце міскі,
На услон таўканіцы паклаў.

Я прагна яе намацваў...
Гэта было пасля вайны.
Расказала пра гэта маці
З пачуццём віны.

Услон потым вынеслі з хаты,
Ён доўга пад вішняй стаяў,
А аднойчы, зялёны, бухматы,
Звіхнўся лапкамі, ўпаў.

Мы з дзедам стаялі моўчкі
І кожны з нас хаваў:
Дзед –- галодныя пасляваенныя ночы,
Радаснае дзяцінства –- я.

**60**

Снег іскрыўся і, мякка-воскавы,
Ўдалячынь рассыпаў агні.
Да ляска,
Што стаяў за вёскаю,

www.kamunikat.org

Працягнуліся
Дзве лыжні.
Ішлі побач
Светлым бярэзнікам
І блудзілі за кругам круг.
Потым раптам змяшаліся,
Глыбей прарэзаліся,
І ад палак ямкі --
Выпалі з рук...
Потым доўга адна
Блукала асіннікам
І, здаецца, цвіла яна,
Сакавіцкая
Сіняя-сіняя
І апошняя ўжо
Лыжня.

**61**

Адшапацеў па лісцях вішні,
Прыбіў пылок
І сціх, увішны.
Навокал так празрыста.
У лужах гусі пырскаюць.
З неба сонца падае.
Пяе у хаце радыё,
Вакно ж раскрытае,
Меладыя, абмытая
Дажджом,
Цурчыць, ласкавая.
Рытмічна кроплі пляскаюць
Са стрэх,
Як пальчыкі па клавішах.

www.kamunikat.org

Паслядажджовай казкаю
Глыбока дыхаю.

**62**

Ходзяць буслы па балоце,
Пільна-цыбата-строгія,
Справай важнецкай занятыя:
Клюнь –- і гатова жаба!

Знайсці б дзе бусла такога,
З пільнай дзюбаю,
Каб у чалавечым балоце выкляваў
Слізкія жабы-душы...

**63**

"Дзякуй богу, ёсць чым ганарыцца!" –-
Скажа маці. І шчасце ў вачах загарыцца.

Ганарыся, чалавеча, сваімі рукамі,
Што дужэлі ў зямлі, працавалі вякамі.

Ганарыся сваёю цёплаю хатай,
Добраю жонкай, сталом багатым.

Ганарыся, дзяўчына, сваёю красою,
Лёгкім станам, цяжкай касою.

Зямля, ганарыся буйным калоссем.
Луг, ганарыся тоўстым пакосам.

Вышынёй сваёй ганарыцеся, дрэвы.

Дуб, ганарыся сваім карэннем.

Ганарыцеся, птушкі, свам крыллем.
Ганарыцеся, дзеці, свамі крыкам.

Ганарыцеся ўсе, хто пад ясным небам,
Хваліцеся, нічога таіць не трэба
Ад маці.

**64**

Плююць на зямлю –-
Ад бушуючай злосці,
Ад справядлівага гневу,
Ад сэрца плююць,
Адкрыта.

Плююць у вочы –-
Ад бяссільнай ярасці,
Плююць бабы і мужчыны,
Плююць з выклікам,
З пенай на губах.

А ціхенька і непрыкметна,
З агіднай усмешкай,
З ліпкім страхам –-
Плююць у душу.

Зямля –-
Нічога не адказвае.
Вочы –-
Могуць загарэцца такой жа ярасцю.
А душа –-

Навекі застанецца акрываўленай.

**65**

Беленькія слупікі.
Нітачка шашы.
Цэлы свет пад крыллямі
Маладой душы.

Дзе прыстаць –- не ведаем.
А навошта знаць!
Беленькія слупікі
Мільга-мільгацяць.

Ад бяды вясновае
Неспакойных рэк
Да бяды асенняе –-
Цэлы-цэлы век!

Крылы нам не звязаны,
Далі берагоў.
Праляцім па свеце мы
Тысячы кругоў.

Потым хай жа кружыцца
Галава ў цішы...
Беленькія слупікі,
Нітачка шашы!

www.kamunikat.org

**66**

Адшапацела. Адляцела. Адплыло.
Было ты, лета бабіна, ці не было?

Удары восеньскіх напорыстых вятроў
Зноў наламалі ў лесе ўдоўіх дроў.

Бяроза лісце ураніла пад акно —
І стала ў хаце гола і відно.

**67**

Сем гадоў пярыну збірала,
Колькі гусей зарэзала.
А дачка расла-падрастала
Свавольніцай і гарэзаю.

А прыйшла пара --
І пасцель -- гара!
Высока-высока
Лёгкі пух,
Аж займае дух.
Тую вяршыню
Пакараюць удвух.

**68**

Ваенная кафедра. Універсітэт.
Лясок. Блізкі шэпт палёў.
Раскрывае маёр Бялоў
Сакрэт:
Глыбіня – 60,
Шырыня – 50.

www.kamunikat.org

Даўжыня – па росце.

Ацэнка 5 за 30 мінут.

Капаць!

Даруй мне, зямля,

Я капаю акоп.

Я помню:

Пахне ў гародзе кроп.

Жаўранак песню ілье на лясы.

Расчэсвае мама мае валасы.

На ранішняй вёскай сонечны сноп.

Я капаю акоп.

Маскірую з улікам мясцовых прыкмет —-

Стаўлю на бруствер кветак букет.

Вось і гатовы салдацкі дом.

Кладуся на мяккае дно.

Толькі сіняе неба відно.

Пахне зямлёй.

Я —- зерне.

Мне цёпла,

Мне хочацца ў забыцці

Яблыняй светлай з акопа расці.

**69**

Далёка ад дому,

Калі заблуджуся

І свету напрамкі

Зусім страчу-

Я ўспомню

Вёску сваю ў Беларусі

І як перад сабой

Усё ўбачу:

Вокны нашай хаты --
На поўдень.
Тут вясной са страхі
Звісалі ільдзінкі,
А летам,
Як пройдзе дожджык,
Кроплі ў пяску ля сцяны
Выбівалі дзіркі.
Калі стаць да вокнаў тварам,
То справа будзе усход,
Там жыве Даніліха-удава.
Па левую руку жыве глухаваты Максім...
Гэтак яскрава ўбачыцца свет,
Што ўсюды напрамак сабе адшукаю.
Мой компас -- Горск.

**70**

Далёкі снегапад -- як сад,
Мільготкі, лёгкі, белапенны.
Мы йдзём туды з табой,
Назад
Мы ўжо не вернемся, напэўна.

Ідзём наперад.
Снегапад
Ад нашых скроняў так далёка.
Не верыцца, што проста, лёгка
Абеліць іх і весні сад.

www.kamunikat.org

**71**

Эх, песня ажыла!
Выжыў запявала.
“Я ненавіджу вас, --
Маці закрычала,-
Мілыя мае”. --
Маці галасіла,
Дзе пахаваны сын,
Расказаць прасіла.

Чарніў медалі пыл
У салдатні вясёлай.
Яны з вайны ішлі
Праз папялішчы сёлаў.

Пасляваенны час.
Сляза і песня спораць.
Здружылі людзі вас,
Нянавісць,
Радасць,
Гора.

**72**

Пад соннай яблыняю вулей
Аж трохся, так гудзеў.
Было у пчолаў шмат надзей,
А хлапучкі трывогу чулі.

За вёскай зацвітала грэчка
І вабіла пчаліны зрок.
Ды лівень недарэчны

Ударыў.
І вулей змоўк.

Грамы далёка грукаталі.
А мы з павагай пазіралі,
Як пчолы к вулею паўзлі
Па мокрым лісці, па зямлі...

**73**

“Шчаслівы ў мяне лёс”. --
Так думаў раніцой.-
Сягоння буду я
Каровы пасвіць з ёй”.

Мы цэлы дзень удвух
Хадзілі па лясах,
Па муражных лугах,
Абедалі ў цяньку --
Над намі лісцядах.

І тут упалі у траву...
Гудзелі ўсе чмялі.
Кульнуўся дыск зямлі
І стукнуў ў галаву.

І гэты дзень, сябры,
Я часта ўспамінаў,
Бо я з тае пары
Яе падпаскам стаў.

www.kamunikat.org

**74**

Ах ты, Белка мая!
Галаву павярнула і замычала.
Год не бачыла, а пазнала.
Я хуценька да яе падыйшоў,
Паскроб паміж рагоў,
Паляпаў па шыі,
Пагладзіў па спіне --
І стала надзейна мне.

**75**

Бель затуманеных агнёў
На луг паволі ападала
І травы прымінала
Асеннім днём.

Снег упадзе й на галаву.
Эх, галава ты маладая!
Няўжо зялёную траву
Змарозіць восень залатая?

**76**

Habent sua fata libelli.
Кнігі зарывам чорным гарэлі.
Потым лісткі сіратліва бялелі.
Habent sua fata libelli.
Колькі у мроях прайшо апантана
Воч невідушчых, бяссонных світанняў!
Зноўку і зноўку -- бязлюдныя плёсы.
Зноўку ушчэнт разбіліся крыгі.
Дзе тыя людзі, іхнія вёсны?
З імі жылі мы, а расталіся мігам.

Кнігі маюць свае лёсы.
Людзі маюць кнігі,
Якія хочуць.

**77**

Скала навісла, як цяжкае гора
Над вольнай вадой.
Хвалі вырасль, падняліся да зораў,
Рынуліся на скалу грамадой.
Яны разганяліся,
Грудзьмі біліся...
Калі скальны кавалак скалануўся і патануў --
Хвалі стомлена адкаціліся,
Падтрымліваючы адна адну.
Плёс гаіў іхнія раны,
Ўбіраў у сябе пену -- іх боль...
Я хацеў бы ў такім акіяне
Растварыцца кропелькай --
Сабой.

**78**

Пушынка ў сонечным леце
Ў нябёсах прапала --
У далёкім балеце
Жанчына лятала.

У дзіўнай самоце
Не дыхала цёмная зала.
Раптам у бязважкім палёце
Жанчына растала.

www.kamunikat.org

Струны ў скрыпках згаслі,
А можа, і пелі.
Як песня аб шчасці --
Жанчына ляцела.

Затым у мужчынскія рукі
Яна прыляцела --
І ад пацалунку
Уся пацяжэла.

**79**

З цемры валіць снег,
Заляпляе вокны.
Мае крылы цяжэюць-мокнуць,
Мне сумна ў сне.

Стома крылы мае саб"е.
Пад ранак тужлівыя вочы.
Мне хочацца у сне, штоночы
Узляцець вышэй сябе.

**80**

Як хлынуў вымучаны дождж,
Я не памчаўся басанож.
Я доўга з нівамі пакутаваў,
І без вады гаючай сох.
Калі ж ударылі раскутыя
Нябёсы ліўнем, бляскам, грукатам,
Я толькі змог
Раскрыць акно --
І аглушыла ўраз яно.

На луг на нівы, на сады
Патокам радаснай вады
Каціўся хмельны дым.
Пусціцца мне бы за парог
Са ўсіх ног,
Смяяцца, бегаць!..
Я глядзеў, як дождж сячэ,
І паўтараў: яшчэ давай, яшчэ!

**81**

Таропкасць сцішаных варон
У бок барвовага заходу.
Сцякае неба, як гудрон
Расплаўлены,
Ца агароды.
І цені па зямлі,
Як ручаі гудрону,
Яны варонаў паднялі --
І хрыпла каркнулі вароны.
Расталі.
Не відно вароніх крыл --
Чырвоных,
Жоўтых,
Шэрых,
Чорных.
Спаліў і сцёр іх небасхіл,
Перавярнуўшыся, як жорны.

**82**

Дрэва сціскалася, гуло,
Балюча вадзіла доўгай тонкай шыяй.
Але нічога зрабіць не магло.

Пякучым агнём яго цела піла прашыла.
Дрэва да ветру галіны свае
Узнімала, узяць у неба прасіла.
Але вецер прыціх.
Дрэва, ветру не вер.
Дрэва пілу заціснула апошняй сілай.
Здраднік-вецер хватку дрэва разагнуў,
Піла дарэзала мяккае цела.
І мёртвы ствол пілу адштурхнуў --
Яна ашчэрылася, далёка адляцела.

**83**

“Просім, просім, гэй да падарунку!”
Мел кавалкамі ляціць са столі.
Дарэць шоўкі, шаліноўкі і карункі,
Дарэць безліч аксамітавых настольнікаў.

“Красных дружак, гэй, да падарунку просім!”
“Каб багата нашым маладым жылося,
Дзетак развялося, як ў бары апенькаў,
Маладым рублі дару і капейкі!”

А другая дружка к маладому:
“Я дару, міленькі, звонкаю дугою,
Каб ты быў смірненькім, не хадзіў з другою,
Каб ні з кім не знаўся, толькі з дарагою!”

Гэй вы дружкі, маладога пашкадуйце!
Падарыла трэця ладненькі хамуцік,
Лейцы падарылі шырынёй з далоню,
Дзве аглобліны і крэпкую супоню.

www.kamunikat.org

І два путы.
Усё было прыпасена даўно.
Усё дарылі як дарэчы.
Толькі б вывесці мілога з-за стала й запрэгчы,
Крыкнуць:"Но!"

**84**

На грамніцы
Певень нап"ецца вадзіцы.
А маладзіцы ––
Падмочаць спадніцы.

Будуць спадніцы
Ля печы сушыцца,
Калені белыя
Будуць свяціцца.

Захмялее певень
Ад весняй вадзіцы,
На дасвецці забудзе
Збудзіць маладзіцу.

Будзе спаць – не прачнецца
На світанні ўдавіца.
Не кажу і не знаю,
Што будзе ёй сніцца.

**85**

Канарээечка-пташка
Громка пяе.

Спрадвеку разводзяць
У клетцы яе.

Забыўшы усё,
Пяе-заліваецца.
Чую, не тое
У песню ўліваецца.

Канарэечка-пташка
Пераймае скрып дзвярэй.
Гэтакі спеў
Душу раздзярэ.

**86**

Калі не было яшчэ слоў,
Былі ў чалавека слёзы.
Таму вось і зараз,
Калі не хапае слоў
Ад гора,
Або ад шчасця, --
Слёзы маўклівыя
Вочы нам засцяць
Без слоў.

Бясслоўе -- як бязлюддзе.
Ірвуцца словы на прастор.
Куды ірвуцца?!
Чаму ў душы маёй не застануцца?

**87**

Хоць кожнай ночы ідзе
На змену ззянне дня --


www.kamunikat.org

Не схаваешся ты нідзе,
Я, бяссонніца, як ноч, адна.

Я, бяссонніца, як зямля, адна.
Жыццяў хоць сто пражыві —-
Буду піць да відна
Глыбіню тваіх дум і крыві.

**88**

Над палямі імжастымі,
Над ранішнім сном хацін
Птушка крыламі шастае
Да родных мясцін.

Недзе ў птушынай свядомасці
Адбітак жыве:
Гняздо ў сасонніку,
Дзеці някормленыя ў траве.

Азвярэлы нарвецца лівень,
Саб"е ў дарожны пыл.
Сярод дзён нешчаслівых --
Мігценне птушыных крыл.

Здавацца птаха не хоча.
Сярод жыццёвых пагроз
Згустак памяці і заклапочанасці —
Маленькі птушыны лёс.

**89**

Вясеннія лужы
Па вёсцы ляглі,

Каб людзі нікуды
Прайсці не змаглі,
А толькі ў хатах
Сядзелі.

Ды людзі праходзяць
Па лужах уброд,
Змачыўшы калені.
Ну, што за народ,
Па лужах іх цягне
Прайсціся.

Вясеннія лужы,
Воблакі ў іх.
Кроплі дожджыка
Светлага
Падаюць з сонца.

Мае землякі --
Вясёлы народ.
Па лужах ідуць,
Хоць не трэба.
Шчырыя дзяцькі і цёткі,
Як дзеці.

**90**

Эй, дарога,
Шпурні  пад колы
Машыны нашай
Валун!
Каб кузаў вышэй
Падскочыў,

www.kamunikat.org

Каб піск дзявочы
Стаяў у вушах,
Каб дзеўкі смірнелі
Ў абдымках хлопцаў.

Эх, добра ехаць
Сена грэбсці!

**91**

Раптам у небе,
Што вісне свінцом, --
Гром асенні, глухі,
Апошні гром.

Лета бабіна,
Як бікфордаў шнур,
Падпаліў журавінаў агонь,
Журавы ўзмахам крыл
Раздзьмулі яго --
І выбух!
З бяроз жоўталіст шугануў.

Узарвалася лета,
Спаліла сябе.
Вецер у шыбы
Трывожна б”е.
Над прыціхлым сялом --
Апошні гром.

www.kamunikat.org

**92**

Упалі цяжка лісты
На плечы Купалы.
Я і ты
Моўчкі стаялі.

Жоўтапад-лістапад.
Асмужаны далі.
Журавы сталі ў рад,
Выгнання чакалі.

Лясы імгляцца-дымяць.
Купала, гляджу ў вашы вочы.
Смуткам растання стаяць
Казанскія ночы.

Бяскрылы жураў
У сне маім уваскрэсне:
Купала Беларусь пакідаў,
Паранены ў песню.

На пасечанае асцё
Тая песня ўпала.
Восень. Гарыць лісцё
У скверыку Янкі Купалы.

**93**

Выйшаў дуб на ўзлесак
Сцежкаю цяністаў,
Сонечныя ўсплескі
Прагна піць стаў лістам.

www.kamunikat.org

І з вятроў салёных,
І з дажджоў імклівых
У лістах зялёных
Выплаўляе сілу.

З кроны кучаравай
Сіла гэта льецца
Пад кару каравую,
Дзе задубянець ёй.

Сіле сваёй гордай
Дуб пакорны,
Але з кожным годам
Рэдзей, рэдзей яго крона.

**94**

Як цёплая кошачка,
Ты ў мяне на каленях.
Штось ласкавае шэпчаш
І соладка дрэмлеш.

Аддаеш мне губы,
Свае белыя грудзі.
“Не трэба, любы!
Убачаць людзі!”

Задыхаешся, цалуеш.
Я розум страчваю.
Пад тугою спаднічкаю
Ногі гарачыя.

www.kamunikat.org

**95**

Калі чыстыя-чыстыя
Блізка вочы,
Калі слова вялікае
Вось-вось народзіцца,--
Тады ціха становіцца
Ва ўсім белым свеце,
Дзе больш нікога няма.
Толькі я і ты.

**96**

Дзесь у сэрцы сырых
Заімшэлых бароў
Выспяваў усю зіму
Першы гром.
Там, пад лістам,
Як туга начынены шар,
Незгарэлы кавалачак
Лета ляжаў.
Калаціліся кроплі
Звонка па ім.
Яго першы ручай
Непрыкметна падмыў.
Тут сонечны промень
Клюнуў яго --
І лопнуў ён громам,
І бліснуў агонь.

**97**

Пуск дызеля

вы калі-небудзь бачылі?
Ведалі,
што я –- лаўкач?
Дык глядзіце:
Рывок шнурком –- і трэскам гарачым
Па перапонках б”е пускач.
Рукі пяшчотна ўключаюць муфту.
Дызель натужліва ўвесь дрыжыць,
У гэту мінуту
Ягонае сэрца пачынае жыць.
Хвілі напружання.
Белы дым.
(Пускач ашалела строчыць.)
Дызель размерана заракоча –-
Цэлы дзень ён будзе сэрцам маім.

**98**

Так хутка вырас аднагодка-клён,
Так нечакана.
Пакуль я ў пошуках сябе марнеў,
Ён столькі лісця начаканіў,
Што перагнаў мяне.
Ён урастаў,
Адзінаю набухшы мэтаю,
У неба і зямлю.
А я гарэў і стыў,
Хацеў стаць чалавекам і паэтам,
І падалі пад стол
Чарнавікі-лісты.
У васемнаццаць
Я пакінуў хату матчыну,
Я спадзяваўся на бясконцасць дзён.

А клён над вёскаю
Падняўся мачтаю.
Ён –- клён!
А я ўсё –- маладзён.

**99**

Мой гарызонт --
Няўтольнае жаданне і пакуты.
Я нарадзіўся у маленькім куце,
Да нізкай столі даставаў вазон.

А ў Беларусі-то –- бары!
І вынасныя хвоі!
Разгорнуты далёка угары
Нябёсаў сінія сувоі.

Мой светлы, мой жаданы гарызонт --
Зямлі і неба дзіўная супольнасць.
Калоссем шастае, гамоніць поле,
Над ім разумны жаўруковы звон
Штодня напамінае мне,
Хоць плач,
Што толькі жаўранак -- спявак,
А я –- слухач.

**100**

Бліскае тэмра ночная.
Гонта гудэ од воды.
Хата дрыжыт от грому.
Мама плачэ од страху
І задыхаецца од астмы.
“Толік, глянь у окно:

Шчо там горыт?”

“Ванькына хата, мамо”.

Над хатою Ванькы косматы огонь.

Мама лежыт і хрыпыт:

“Сыночок! Кончыўса тэофэдрын,

Бэжы до Кулёўчыхы,

Бо умру”.

Нэбо ззяе і б’е.

Горчакы бэгут на пожар,

А я –- по Тэофэдрын для мамы.

Бэгу і молюса на Тэофэдрын.

Тэофэдрын –- ўсэвышні,

Як Пэрун.

*1963-1968,*

Горск-Мінск

www.kamunikat.org